УДК 82–14(476)

**Л.М. ГРЫЦУК**
Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна

## АНТЫЧНАЯ ЭЛЕГІЯ: ВЫТОКІ І ЭВАЛЮЦЫЯ ЖАНРА

Элегія – з грэчаскай мовы ἐλεγεία – жанр лірычнай паэзіі. Форма старажытнага элегічнага твора – двухрадкоўе, якое складаецца з спалучэння гекзаметра і пентаметра. Першапачаткова пад элегіяй разумеўся кожны двухрадковы верш, незалежна ад зместу, хоць слова ἔλεγος азначала ў старажытных грэкаў журботную песню, выкананую пад акампанемент флейты. Элегія спачатку не спявалася, а чыталася напеўна. Вылучылася ў эпічным родзе літаратуры прыкладна ў той час, калі праходзілі першыя Алімпіяды. Першыя элегіі складалі іанійцы – племя ў Малой Азіі, а следам за імі атыкі і александрыйцы. Кожны жанр (і элегія не з'яўляецца выключэннем) вызначаецца комплексам прымет і ўстойлівых рыс. Адметнымі рысамі старажытнай элегіі быў яе невялікі памер, эмацыянальная экспрэсіўнасць, непасрэдная сувязь з сучаснасцю і дыдактычнасць. Самыя старажытныя элегіі не былі пазбаўлены міфалагічных тэм і вобразаў, таму што згодна з традыцыямі эпасу выступалі як нарматыўныя ўзоры для мастацкага твора.

У элегіі паэт самавыяўляецца, аповед вядзецца ў цяперашнім часе. Але да свабоднага, высокага палёту думак антычныя элегікі не падымаліся. Сюжэты элегіі не ахоплівалі велічнай карціны жыцця народаў і вялікіх здарэнняў настолькі, як у эпасе, але ў элегіях апісвалі выбраныя з блізкага акружэння пачуцці і з'явы. Элегія ўяўляе сабой "эмацыянальны маналог, вызвалены ў тэксце твора ад якой-небудзь індывідуалізаванай канкрэтнасці быцця" [4, с. 67]. Медытатыўнасць многіх лірычных твораў – гэта іх дамінантная родавая асаблівасць, без якой лірыка як род літаратуры страчвае сваю адметнасць. А ўвогуле медытатыўная лірыка з'яўляецца яркім узорам таго, як у слоўным мастацтве адбываецца сінтэз знешняга і ўнутранага, як гэтыя фактары ўдала ўзаемадзейнічаюць.

Найбольш старажытныя грэчаскія элегіі выконваліся на ўрачыстых бяседах, святах і былі тэматычна разнастайныя: то поўніліся заклікам да барацьбы (Калін, Феагнід, Тыртэй), то прасякаліся роздумам пра сусветны і дзяржаўны парадак (Салон), пра сутнасць чалавечага жыцця, каханне (Мімнерм), пра вытокі мудрасці (Факілід), то станавіліся своеасаблівымі філасофскімі павучэннямі, сентэнцыямі (Ксенафан).

У грэкаў заснавальнікам элегіі лічыцца Калін Эфескі (нар. каля 675 г. да н.э.). Гэта самы старажытны з вядомых нам лірыкаў. На яго творы

паўплываў гамераўскі эпас. Напісаны яны былі элегічным памерам. Захаваўся з напісанага паэтам толькі ўрывак ў дваццаць адзін радок, у якім Калін Эфескі палка натхняе грамадзян на барацьбу супраць кімерыйцаў, што ўварваліся ў Малую Азію: “Скоро ль воспрянете вы? Когда ваше сердце забьется // Бранной отвагой?” [1, с. 93]. У адрозненне ад геаічнага эпасу, у элегічных творах сцвярджаецца думка пра тое, што паколькі смерці нікому не пазбегнуць, то трэба актыўна змагацца з трагедыйнымі абставінамі [3, с. 12].

У агульнаграмадзянскіх элегіях афінскага заканадаўцы Салона адлюстравана жыццё новага пакалення, паказаны яго новыя абставіны, фігуруе новая Грэцыя на чале з іншым горадам-дзяржавай (полісам). Да нас дайшлі амаль дзвесце радкоў з элегіі, урыўкі ў ямбах і трахеях гэтага паэта. Элегія “Саламін” складаецца з пяцідзесяці радкоў, поўных заклікаў да змагання за востраў Саламін: “На Саламин! Поспешим и сразимся за остров желанный, // Чтобы с отчизны стряхнуть горький и тяжкий позор” [3, с. 75-76]. Згодна з традыцыямі паэтыкі элегіі, усе агульныя палажэнні і рэкамендацыі паэт заўсёды раскрывае на канкрэтных прыкладах і тым самым стварае эфект іх сапраўднасці. Адкрыццём Салона, якое мела вялікае значэнне для ўсёй далейшай гісторыі элегічнага жанру, становяцца выявы асабістых пачуццяў, пережыванняў у яго творах [3, с. 16-18].

Паступова аўтары адыходзілі ад адлюстравання грамадскага жыцця і пачыналі пісаць сімпатычныя (застольныя), эратычныя (любоўныя) і фрэнэтычныя (жалобныя) элегіі.

Старажытная рымская элегія, у адрозненне ад грэчаскай, уяўляла літаратурную плынь, якая адмаўляла ідэалогію прынцыпату. Рымскія элегікі адмовіліся на афіцыйным узроўні праслаўляць прынцэпса, рымскіх знакамітых дзеячаў. Адзінае, што, на думку элегічных паэтаў Рыма, магло стаць сэнсам жыцця – гэта каханне. Таму рымская элегія не адзначаецца разнастайнасцю сюжэтных сітуацый і матываў, найчасцей сюжэт быў адзіны: бедны паэт, яго каханая, багаты супернік. Найбольшая ўвага надаецца вобразу каханай, сам жа паэт “хаваецца” ў створаным ім умоўным вобразе лірычнага героя. Ва ўмовах прынцыпату Аўгуста паэты не маглі свабодна выказваць пачуцці, паказваць старонкі сваёй біяграфіі, спыняцца на канкрэтных жыццёвых фактах, таму стваралі ўмоўны вобраз лірычнага героя, блізкага ім па светаўспрыманні, але не ідэнтычнага, даволі абстрактна паглыбляліся ў тэму кахання. Больш удала яны раскрывалі асабістыя душэўныя перажыванні закаханых герояў. Але паступова надыходзіў час крызісу і любоўнай элегіі, звязаны з тым, што грамадзянская пазіцыя паэта, ізаляванага ад знешняга свету, аказвалася не зусім прыймальнай, даволі штучнай, па гэтай прычыне і ўнутраны свет элегічнага паэта звужаўся. Максімальнае звужэнне праблематыкі прывяло

да збяднення зместу жанра. Агульныя месцы, матывы, якія паўтараліся з твора ў твор, у далейшым былі "аздоблены" толькі фармальным эксперыментатарствам, творы на ім і трымаліся.

Рымская элегія таксама, як і грэчаская, адлюстроўвае многія моманты грамадскага жыцця. У эпоху Актавіяна Аўгуста адны паэты абураліся падзеннем грамадзянскай маралі правячых колаў імператарскага Рыма, што назіраецца нават у іх ідылічнай лірыцы, супрацьпастаўлялі мітусню і разбэшчанасць гарадскіх жыхароў простаму, ціхаму жыццю сялян ("Сабінскі домік" Гарацыя, "Буколікі" Вяргілія). Другія (Праперцый, Авідзій) бачылі выйсце з экстрэмальнай сітуацыі ў каханні. Рымская любоўная элегія фарміруецца і дасягае свайго росквіту ў творчасці Тыбула, Праперцыя і Авідзія. Развівалася ў гэты час таксама і "эталагічная" элегія.

У элегіях Авідзія – прадаўжальніка традыцый паэтаў Тыбула і Праперцыя – знаходзім не толькі вядомыя па ранейшай паэзіі матывы і сітуацыі, але таксама і новыя рысы: дасканаласць рытарычнай арганізацыі мовы, страсную эмацыйную афарбоўку, дасціпнасць аповеду. У "Журботных элегіях" і "Пасланнях з Понта" Авідзій стварыў новую элегію, герой якой не ўмоўная асоба, не міфалагічная істота, а сам паэт-выгнаннік. Тэмай яго элегій з'яўляюцца яго асабістыя перажыванні і пачуцці: "Друга здесь нет, кто меня утешал бы занятным рассказом // И заставлял забывать времени медленный ход" [2, с. 498].

У перыяд элінізму элегія страчвае сваю ранейшую "ўрачыстую" функцыянальнасць, ствараецца для абранага кола людзей – знаўцаў літаратуры, яе аўтары, імкнучыся да мастацкай дасканаласці, памяншаюць памеры твора, дабіваюцца большай афарыстычнасці. Асноўным жанравым матывам становіцца матыў кахання. Цікавасць да творчасці паэтаў-элегікаў мінулага абумоўліваецца сёння тым, што яна несла ў сабе зародкі сапраўднага псіхалагізму і філасафічнасці, паглыбляліся ў сферу інтарэсаў герояў, якія тонка адчувалі супярэчнасці жыцця, у свет інтымных перажыванняў, асабістых захапленняў людзей.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Античная литература. Греция. Антология. Ч. 1. / Сост. Н. А. Федоров, В. И. Мирошенкова. – М. : Высш. шк., 1989.

2. Античная литература. Рим. Антология / сост. Н. А. Фёдоров, В. И. Мирошенкова. – 2-е изд., испр. – М. : Высш. шк., 1988.

3. Древнегреческая элегия / сост., коммент., словари доктора филол. наук, проф. Н. А. Чистяковой. – Спб. : "Алетейя", 1996.

4. Поспелов, Г. Н. Лирика: Среди литературных родов / Г. Н. Поспелов. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 1976.